УДК 378.147

# ПАДРЫХТОЎКА ПЕДАГОГАЎ-ЛАГАПЕДАЎ У АДЗІНАЙ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ ЎНІВЕРСІТЭТА І МУЗЕЯ

**С.Д. Грынько**
*Установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"*

*Адным са шляхоў да творчага развіцця асобы ў адукацыйнай сістэме, рэалізацыі яе здольнасцей, пашырэння магчымасцей для самаактуалізацыі можа стаць адкрытасць адукацыйнай сістэмы ўніверсітэта да ўзаемадзеяння з музеем, які таксама вырашае задачу адукацыі асобы ў грамадстве.*

*Мэтай артыкула з'яўляецца раскрыццё праблемы прафесійнай падрыхтоўкі педагогаў праз стварэнне адукацыйнай прасторы "ВНУ–музей" (на прыкладзе работы са студэнтамі спецыяльнасці "Лагапедыя").*

***Матэрыял і метады.*** *У эксперыменце прымалі ўдзел 30 студэнтаў першага курса дзённай формы навучання спецыяльнасці "Лагапедыя" педагагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. У якасці метадаў выкарыстоўваліся апісальна-аналітычны і параўнальна-супастаўляльны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Выдзелены якасці асобы будучага педагога, фарміраванне якіх ажыццяўляецца ў адзінай прасторы "ўніверсітэт–музей": гістарызм мыслення (прынцып падыходу да рэчаіснасці, якая развіваецца ў часе); цэласнасць успрымання з'явы (уласцівасць успрымання, якая заключаецца ў тым, што кожны аб'ект, а тым больш прасторавая прадметная сітуацыя ўспрымаюцца як устойлівае сістэмнае цэлае, нават калі некаторыя часткі гэтага цэлага ў дадзены момант не назіраюцца); культурнасць у паводзінах (высокі ўзровень культуры ў дзеяннях, што адпавядае светапогляду асобы, яго перакананням); эстэтычнасць поглядаў і паводзін (вытанчанасць, прыгажосць, прасякнутыя эстэтызмам).*

***Заключэнне.*** *Створаная адукацыйная прастора ўніверсітэта і музея пры падрыхтоўцы педагогаў-лагапедаў забяспечвае комплекснае фарміраванне такіх якасцей, як гістарызм мыслення, цэласнасць успрымання з'явы, культурнасць у паводзінах, эстэтычнасць поглядаў і перакананняў, што дае падставу гаварыць аб якаснай прафесійнай падрыхтоўцы будучага спецыяліста ў галіне педагогікі на аснове яго асобаснага развіцця.*

***Ключавыя словы:*** *падрыхтоўка педагогаў, адукацыйная прастора, музей, асобаснае фарміраванне.*

# TRAINING TEACHERS-SPEECH THERAPISTS IN COMMON EDUCATIONAL SPACE OF THE UNIVERSITY AND THE MUSEUM

**S.D. Grynko**
*Educational Establishment "Grodno State Yanka Kupala University"*

*Openness of the educational system of the university for collaboration with the museum, which promotes an individual's education in society as well, can be one of the ways of creative development of the individual in the educational system, implementation of his abilities, increasing opportunities for self-actualization.*

*The purpose of the article is to reveal the issue of professional teacher training through creating educational space "University–Museum" (the example of the work with Speech Therapy students).*

***Material and methods.*** *Thirty first year full time Speech Therapy students of Grodno State University Education Faculty participated in the experiment. The descriptive and analytical as well as the comparative methods were used in the research.*

***Findings and their discussion.*** *Traits and attributes of a would-be teacher, which are shaped in the common area of the University–the Museum, are identified: historicism of thinking (the principle of the approach to reality, that is evolving over time); perceptual unity (the property of perception is that each object, all the more a spatial substantial situation are perceived as an sustainable systemic whole, even though some parts of this whole are not observed at the moment); culture of the conduct (the high level of culture in the actions in accordance with the individual's world view and beliefs); aesthetics of the views and conduct (sophistication, beauty imbued with aesthetics).*

***Conclusion.*** *The established educational area of the university and the museum for training teachers-speech therapists provides the comprehensive development of such attributes as historicism of thinking, perceptual unity, culture of the conduct, aesthetics of the view and conduct. All that gives ground for claiming that training of would-be education specialists on the basis of their personal development is high-quality.*

***Key words:*** *training teachers, educational space, museum, personal development.*



Репозиторий ВГУ

У сучаснай педагагічнай навуцы ўсе дыскусіі наконт рэфармавання сістэмы адукацыі краіны, як правіла, не абыходзяцца без абмеркавання праблемы падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Яшчэ ў XIX стагоддзі выдатны рускі пісьменнік і педагог К.Д. Ушынскі справядліва сцвярджаў, што “ва ўсёй школьнай справе нельга нічога палепшыць, абыходзячы самога настаўніка”.

Якім павінен быць сучасны педагог? Якая яго роля ў выхаванні новага пакалення? Якім чынам настаўнік павінен арганізоўваць сваю працу, каб адпавядаць патрэбам часу і заняць уласнае месца ў фарміраванні асобы навучэнца? Гэты шэраг пытанняў можна працягваць. Іх дыктуюць сам час, змены, якія адбываюцца ў грамадстве: навукова-тэхнічны прагрэс, развіццё сродкаў масавай інфармацыі, глабалізацыя эканамічных праблем, інфарматызацыя ўсіх сфер жыццядзейнасці чалавека. Даследчыкі В.Л. Жук, С.М. Сірэнка выдзяляюць некалькі тэндэнцый у развіцці сучаснай сістэмы вышэйшай адукацыі:

- прафесіяналізацыю вышэйшай адукацыі (набліжанасць адукацыі да будучай прафесійнай дзейнасці);
- масавасць вышэйшай адукацыі і актуалізацыю яе якасці;
- узмацненне ролі асобаснага развіцця і ўскладненне задач прафесійнага ўдасканалення;
- укараненне “рынкавых механізмаў” у сферу прафесійнай адукацыі, што абумоўлівае вызначэнне адукацыйных мэт і вынікаў на аснове эканамічнай эфектыўнасці (суадносенне адукацыйных вынікаў і затрат на іх дасягненне) [1, с. 6].

Даследчык праблем падрыхтоўкі педагагічных кадраў І.І. Казімірская адзначае, што “жыццё патрабуе ад будучых педагогаў здольнасці і гатоўнасці мабільна адаптоўвацца да хутказменных сацыякультурных умоў жыцця і прафесійнай дзейнасці, гарманізаваць адносіны са светам і сабой, навучыць гэтаму сваіх вучняў” [2, с. 12].

Зыходзячы з усіх гэтых тэндэнцый відавочным з’яўляецца неабходнасць перабудовы сістэмы адукацыі для падрыхтоўкі кадраў зусім іншага кшталту. І тут ужо на першы план у падрыхтоўцы спецыялістаў да іх прафесійнай дзейнасці выступаюць не веды, уменні і навыкі, якімі яны павінны авалодаць, а асобаснае развіццё, самастойнасць, актыўная жыццёвая пазіцыя, здольнасць адэкватна рэагаваць на перамены і перабудоўваць лінію сваіх паводзін.

Такім чынам, сама рэальнасць і змены ў сістэме адукацыі прад’яўляюць зусім іншыя патрабаванні да якасці працы педагога, ад якой залежыць падрыхтаванасць маладога пакалення, што робіць першыя крокі ў самастойнае жыццё.

Адным са шляхоў да творчага развіцця асобы ў адукацыйнай сістэме, рэалізацыі яго здольнасцей, пашырэння магчымасцей для самаактуалізацыі можа стаць адкрытасць адукацыйнай сістэмы ўніверсітэта да ўзаемадзеяння з іншымі культурнымі і асветніцкімі ўстановамі, якія таксама вырашаюць задачу адукацыі асобы ў грамадстве.

Паводле педагагічнага тэрміналагічнага слоўніка адукацыйная прастора – гэта “своеасаблівы фундамент паміж эмпірычным успрыманнем адукацыйнага комплексу (сукупнасці ўстаноў) і шматкампанентнай і шматузроўневай сістэмай, якая ўключае ў сябе не толькі асобныя школы, ВНУ, навуковыя цэнтры, кіраўнічую структуру са сродкамі навучання, мэбляй і абсталяваннем, але і (што прынцыпова важна) спецыфічныя ўмовы, фактары, сувязі і ўзаемадзеянні суб’ектаў адукацыі, якія вызначаюць характар педагагічных працэсаў” [3].

Па вызначэнні даследчыка А.Ю. Герасімава, які падкрэслівае важнасць менавіта суб’ектнай асновы ў адукацыйнай прасторы ВНУ, цэласнасць якой характарызуецца як сукупнасць абставін, што ператвараюцца асобай ва ўласныя, сістэмна арганізаваныя, якія працуюць па яе “выкліку” [4]. На наш погляд, пашыраючы адукацыйную прастору асобы будучага педагога за кошт выкарыстання адукацыйных сродкаў музея, можна якасна змяніць яго падрыхтоўку, фарміруючы свядомыя адносіны да сваёй нацыянальнай спадчыны, якая з’яўляецца асновай культурнага вопыту і крытычнага стаўлення да сучаснасці, крыніцай для асобаснага развіцця і творчага раскрыцця асобы. Гэта і будзе з’яўляцца ілюстрацыяй суб’ектывацыі вопыту асобы.

Музеі сёння ўспрымаюцца як месца, дзе збіраецца, канцэнтруецца і асвойваецца інфармацыя аб культурным развіцці грамадства. Мэта іх дзейнасці вызначаецца як абарона, выратаванне і захаванне найкаштоўнейшага грамадскага багацця, і «арганізацыя яго сустрэчы з людзьмі» [5, с. 43]. Гэта

Рэпазіторый ВДУ

дазваляе музеям выступаць у якасці грамадскіх інстытутаў, здольных захоўваць для цяперашніх і будучых пакаленняў унікальныя прадметы, гістарычныя артэфакты, творы мастацтва і многае іншае. Падобная ацэнка грамадскай каштоўнасці музеяў з'яўляецца прычынай цікавасці да іх арганізацыі, да асаблівасцей узаемадзеяння музеяў з іншымі грамадскімі і дзяржаўнымі інстытутамі, да новых формаў і спосабаў правядзення экскурсій, да эфектыўных сродкаў супрацоўніцтва з установамі адукацыі, што асабліва значна ва ўмовах хуткіх эканамічных, сацыяльных і культурных змен.

Аднак, нягледзячы на існаванне навуковых даследаванняў аб выкарыстанні сродкаў музея ў адукацыйным працэсе навучальных устаноў, пры наяўнасці канцэптуальных распрацовак па праблеме падрыхтоўкі педагагічных кадраў, пытанне фарміравання прафесійных кампетэнцый будучых настаўнікаў як спецыялістаў у галіне педагагічных ведаў сродкамі музея не разглядалася.

Шэраг расійскіх і беларускіх вучоных даследуюць праблемы прафесійнай падрыхтоўкі будучых педагогаў: А.І. Жук, А.С. Зубра, А.К. Маркава, Л.М. Міціна, А.І. Піскуноў, С.Д. Смірноў, І.Ю. Сцяпанава, І.І. Цыркун.

Усе гэтыя даследчыкі, з розных бакоў характарызуючы працэс прафесійнага станаўлення педагагічных кадраў, сыходзяцца ў адным: падрыхтоўка будучага настаўніка – справа складаная, а ў сучасных умовах тэхнічнага прагрэсу і сусветнай інфармацыйнай прасторы яшчэ больш актуальная і значная, бо патрабуе кардынальнага перагляду функцый педагога, які ўжо не можа быць рэтранслятарам інфармацыі, знойдзенай у падручніку.

Мэтай нашага артыкула з'яўляецца раскрыцце праблемы прафесійнай падрыхтоўкі педагогаў праз стварэнне адукацыйнай прасторы "ВНУ–музей" (на прыкладзе работы са студэнтамі спецыяльнасці "Лагапедыя").

**Матэрыял і метады.** Эксперымент праводзіўся на базе ўстановы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы". У эксперыменце прымалі ўдзел 30 студэнтаў першага курса дзённай формы навучання спецыяльнасці "Лагапедыя" педагагічнага факультэта. Намі была распрацавана анкета, у склад якой уваходзіла 20 пытанняў. У якасці метадаў выкарыстоўваліся апісальна-аналітычны і параўнальна-супастаўляльны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Спектр функцый, якія выконвае настаўнік ў сучаснай адукацыйнай сістэме, дастаткова шырокі:

- з'яўляецца крыніцай ведаў як пад час заняткаў, так і па-за межамі іх;
- арганізуе педагагічны працэс і кіруе ім, стварае педагагічныя ўмовы для паспяховага яго функцыянавання;
- ажыццяўляе ўзаемадзеянне з сям'ёй, праводзіць асветніцкую работу, а таксама рэгулюе і ўзгадняе выхаваўчае ўздзеянне сям'і і адукацыйнай установы;
- забяспечвае ахову жыцця і ўмацаванне здароўя навучэнцаў;
- выконвае ролю кансультанта і дарадцы ў вырашэнні іх праблем;
- садзейнічае развіццю іх творчага патэнцыялу;
- улічвае ў сваёй працы індывідуальныя псіхалагічныя асаблівасці кожнага;
- ажыццяўляе педагагічнае суправаджэнне ў педагагічным працэсе.

У сучаснай школе ў залежнасці ад педагагічнай сітуацыі настаўнік можа выступаць у ролі метадыста, аналітыка, менеджара, псіхолага, кансультанта, лектара, мадэратара, спецыліста па сучасных тэхналогіях, даследчыка і інш.

Але нават пры разуменні шырыні адукацыйных задач настаўніка і неабходнасці ў якаснай яго падрыхтоўцы, якая б адпавядала сучасным патрабаванням да яго кваліфікацыі і прафесіяналізму, адназначнага адказу на пытанне, якім быць педагогу, мы не знойдзем. Гэта залежыць ад шэрага прычын, якія перш за ўсё звязаны са складанасцю самой прафесіі, разнастайнасцю матывацыі і бачання свайго шляху кожным спецыялістам у гэтай сферы дзейнасці.

Сённяшняя сацыяльна-эканамічная рэальнасць вымагае прафесіянальнага стаўлення да выканання справы, гэта значыць, што ў любой сферы дзейнасці патрабуецца прафесіянал. У дачыненні да педагагічнай працы прафесіяналізм – гэта любоў да сваёй працы і да сваіх вучняў. Яшчэ Леў Мікалаевіч Талстой адзначаў, што "калі настаўнік аб'ядноўвае ў сабе любоў да справы і да вучняў, ён дасканалы настаўнік". Педагог-прафесіянал – гэта спецыяліст высокай кваліфікацыі, майстар уласнай справы.

Рэпазіторый ВДУ

У першую чаргу, гаворачы пра прафесіяналізм настаўніка, мы звязваем гэта паняцце з педагагічным майстэрствам, якое разумеецца як "комплекс уласцівасцей асобы, які забяспечвае высокі ўзровень самаарганізацыі прафесійнай дзейнасці" [6, с. 10]. Інакш кажучы, гэта высокая ступень валодання псіхолага-педагагічнымі ўменнямі і навыкамі, здольнасцямі эфектыўна арганізоўваць і ажыццяўляць адукацыйны працэс, якая спалучаецца з пастаяннай працай па самаўдасканаленні і самаразвіцці самога педагога. Як вынікае з усяго адзначанага вышэй, прафесійныя якасці і праца педагога-майстра звязаны з ключавым паняццем – асоба, якое, на наш погляд, з'яўляецца ядром такога шматграннага паняцця, як прафесіяналізм.

Паняцце "асоба" ў педагогіцы характарызуе сацыяльную сутнасць чалавека, яго суб'ектыўнае стаўленне да грамадскіх адносін і дзеянняў. Прырода асобы біясацыяльная, у ёй ёсць біялагічная сутнасць, на аснове якой развіваюцца псіхічныя функцыі і ўласна асобасны пачатак. Менавіта таму даследчыкамі М.А. Бярозавіным, В.Ц. Чэпікавым, М.І. Чэхаўскіх падкрэсліваецца складаная сацыяльна-псіхалагічная цэласнасць дадзенага паняцця, што не зводзіцца да пераліку толькі набытых якасцей чалавека ў працэсе жыццядзейнасці. Гэтыя вучоныя акрэсліваюць паняцце асобы як "сукупнасць індывідуальных сацыяльна-псіхалагічных якасцей, якія характарызуюць чалавека і вызначаюць сістэму яго адносін да навакольнага свету" [7, с. 191]. Такім чынам, асоба ўяўляе сабой складаную іерархічную структуру біялагічнага, псіхічнага і сацыяльнага, якая характарызуе ўстойлівыя паводзіны і дзейнасць чалавека ў дачыненні да навакольнага свету і адносіны асобы да сябе.

Відавочным з'яўляецца тое, што шматграннае паняцце прафесіяналізму педагога вельмі цесным чынам звязана з не менш складанай яго асобаснай сутнасцю, дзе шчыльна сплецены спадчыннасць, псіхічныя асаблівасці і сацыяльны вопыт.

Паколькі кожны чалавек мае сваё меркаванне і адрозніваецца ад іншых, то ў разуменні большасці людзей існуе свой уласны вобраз "узорнага" настаўніка, так званы эталон, якому ўласцівы шэраг якасцей, якімі павінен валодаць педагог-майстар. Згодна з праведзеным анкетаваннем, якое праводзілася намі са студэнтамі дзённай і завочнай формаў навучання спецыяльнасцей "Пачатковая адукацыя", "Дашкольная адукацыя", "Лагапедыя", "Алігафрэнапедагогіка" ў час правядзення заняткаў па дысцыпліне "Педагогіка" і "Уводзіны ў педагагічную прафесію", часцей за ўсё ў пералік гэтых характарыстык уваходзяць: добразычлівасць, камунікабельнасць, гуманізм, інтэлектуальнасць, энцыклапедызм ведаў, адданасць сваёй справе, дысцыплінаванасць, стыльнасць і прывабнасць, акуратнасць, пачуццё гумару і эмпатыя, тактоўнасць, талерантнасць, цярплівасць і вытрыманасць, творчы падыход да працы, веданне сучасных інфармацыйных тэхналогій. Гэты пералік, у які ўваходзяць і маральна-этычныя, і прафесійныя якасці, і адносіны педагога да сучаснай моды і інавацыйных тэхналогій, можа доўжыцца.

Здавалася б, якая неабходнасць у пераліку рыс характару ідэальнага настаўніка, калі дасягнуць аднаго канкрэтнага "рэцэпта" майстэрства педагога немагчыма? На нашу думку, праца па стварэнні мадэлі пэдагога-майстра таму і карысная, што патрабуе аналізу, параўнанняў, прыкладаў, ілюстрацый вопыту дзейнасці выдатных педагогаў сучаснасці і мінулага, бо толькі пастаянная пошукавая праца, рэфлексія, самаадукацыя з'яўляюцца шляхам да поспеху ў прафесійнай дзейнасці. У выпадку педагагічнай працы паспяховай лічыцца тая дзейнасць, якая вядзе да асобаснага развіцця навучэнца, яго сталення і далейшай самарэалізацыі ў жыцці. Згодна з даследаваннямі У.У. Серыкава поспех самаразвіцця дзіцяці залежыць ад умелай суправаджальнай ролі педагога, які зыходзячы са сваёй першаснай функцыі (ст.-грэч. paidagogos – "той, які вядзе дзіця"), павінен "весці дзіця" ў свет дарослага жыцця, дзе ён павінен дасягнуць поспеху. Той прадмет, які выкладае настаўнік, – гэта "інструмент уздзеяння на асобу вучня" [8], а ўсё майстэрства выкладання і выхаваўчай дзейнасці знаходзіцца ў руках педагога. Без цікавасці да асобы педагога, даверу і прыязных адносін не можа быць эфектыўнага засваення матэрыялу, не можа быць сувязі з матывацыйнай і светапогляднай сферамі асобы навучэнца. Яскрава пра гэта сведчыць і народная мудрасць, у якой гаворыцца, што выхаваць "крылатага" могуць толькі "крылатыя" педагогі і бацькі, выхаваць шчаслівага можа толькі шчаслівы, а сучаснага – толькі сучасны чалавек.

Аб важнасці развіцця асобасных якасцей у педагогаў, якія займаюцца адукацыяй навучэнцаў з асаблівасцямі развіцця, у прыватнасці педагогаў-лагапедаў, гавораць сучасныя даследчыкі ў галіне спецыяльнай педагогікі. Напрыклад, Н.М. Назарава дае такому спецыялісту наступную

Рэпазіторый ВДУ

характарыстыку: «…Чалавек з асобым складам душы, актыўны, ініцыятыўны, энергічны, упэўнены ў паспяховым выніку сваей прафесійнай дзейнасці, добразычлівы і тактоўны» [9, с. 212].

Дзейнасць педагога-лагапеда павінна быць значна шырэйшая яго функцыянальных абавязкаў: сяброўская падтрымка, псіхалагічная дапамога ў пераадоленні цяжкасцей, актыўная грамадзянская пазіцыя ў дачыненні да асобаў, якія маюць асаблівасці ў сваім развіцці. Таму найважнейшымі якасцямі настаўніка ў галіне спецыяльнай адукацыі, згодна з Н.М. Назаравай, з'яўляюцца: дабрыня, адказнасць, аптымізм, цярпенне, эмпатыя, энергічнасць, захопленасць сваёй работай, вернасць жыццёвым інтарэсам людзей з абмежаванымі магчымасцямі жыццядзейнасці [9, с. 214].

Неабходна таксама акрэсліць і падыход да асобаснага фарміравання педагога-лагапеда, які вызначаны ў дзяржаўным стандарце. У пералік сацыяльна-асобасных кампетэнцый выпускнікоў спецыяльнасці "Лагапедыя" ўваходзяць грамадзянскасць, здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння і міжасабовых камунікацый, крытычнасць, уменне працаваць у камандзе і ўдасканальваць сваю прафесійную дзейнасць [10].

На нашу думку, якасці педагога-лагапеда павінны быць прадстаўлены больш шырока, чым гэта адзначаецца ў стандарце, бо вялікую ролю ў адукацыйным працэсе мае сам настаўнік, а не толькі той педагагічны інструментарый (арсенал метадаў, прыёмаў, сродкаў і формаў), які выкарыстоўваецца педагогам у яго працы. Перавага тут павінна быць за маральна-этычнымі каштоўнасцямі: дабрынёй, міласэрнасцю, спагадай, добразычлівасцю ва ўзаемаадносінах, ветлівасцю, чуласцю, сардэчнасцю. Гэтыя якасці дапаўняюць характарыстыкі чалавека-прафесіянала сваёй справы: адказнасць, настойлівасць, дысцыплінаванасць, арганізаванасць, самакрытычнасць, здольнасць да самаадукацыі.

Менавіта для такога ўсебаковага развіцця будучых педагогаў-лагапедаў і неабходна стварэнне цэласнай адукацыйнай прасторы ўніверсітэта і музея.

З аднаго боку, музей – тая ўстанова культуры, мэтай якой з'яўляецца збіранне і захаванне найбольш каштоўных набыткаў культуры, увасабленняў духоўнай культуры чалавецтва, а таксама прапаганда і асветніцтва сваіх экспанатаў сярод розных слаёў насельніцтва. Навуковае абгрунтаванне адукацыйна-асветніцкіх функцый музея дадзена ў працах расійскіх і беларускіх даследчыкаў (В.У. Буткевіч, А.Г. Ванслава, В.М. Вdespiteрановіч, І.Г. Лупашка, В.У. Міpончык, А.Б. Мядзведзева, М.В. Нагорскі, Б.А. Сталяроў, М.Ю. Юхневіч).

З другога боку, музей – той сацыяльны інстытут грамадства, які можа зрабіць неацэнны ўклад у справу фарміравання культуры будучага педагога. Адным са сродкаў ажыццяўлення гэтай задачы з'яўляецца музейны прадмет. Гэта маленькае ўвасабленне гісторыі, якое мае эстэтычную вартасць і здольна выклікаць яркія эмоцыі, якія надоўга застаюцца ў памяці чалавека. Музейная экспазіцыя аказвае комплекснае ўздзеянне на асобу, дапамагае ёй усвядоміць сябе прадстаўніком грамадства, зразумець прыналежнасць да пэўнага вітка гісторыі, адчуць веліч і значнасць ролі чалавека на зямлі, ацаніць набыткі духоўнай культуры. Атаясамліваючы сябе з лепшымі прадстаўнікамі грамадства, будучы педагог выдатныя дасягненні культуры праецыруе на сваё ўласнае "я", адчуваючы патрэбу ў сузіранні і выкарыстанні іх у сваёй працы. Сродкамі музея можна скіраваць педагагічны працэс у ВНУ на развіццё прыродных задаткаў чалавека, на фарміраванне яго поглядаў, перакананняў, зрабіць акцэнт на агульначалавечыя каштоўнасці, на культуру свайго народа, краіны.

Адукацыйны патэнцыял "храма муз" дапаможа ў фарміраванні сацыяльна сталай асобы будучага настаўніка, які не толькі ведае аб культурных здабытках свайго народа і агульна прызнаных эстэтычных каштоўнасцях, але і адчувае патрэбнасць у іх сузіранні, прапагандаванні і выкарыстанні ў педагагічным працэсе. На нашу думку, музей з яго высокім узроўнем эстэтычнасці экспазіцый можа аказаць уплыў на светапогляд студэнтаў, на іх навуковыя, мастацкія, маральныя патрэбы і ідэалы, якія застануцца ў іх асобе на ўсе жыцце. Гэта дапаможа настаўніку быць аўтарытэтам для сваіх навучэнцаў.

Перавага музейных сродкаў адукацыі бачыцца нам у наступным:

- цэласнае ўспрыманне гісторыі народа, краю (падзеі, архітэктура, развіццё мастацтва, літаратура);
- фарміраванне светапогляду асобы (веды, погляды і перакананні аб свеце і месцы ў ім чалавека);
- наглядное ўспрыманне дэталяў прадметаў, жывых сведчанняў гісторыі;
- насычэнне працэсу засваення інфармацыі яркімі станоўчымі эмоцыямі, якія закранаюць сферу цікавасцей асобы і садзейнічаюць стварэнню ў яе свядомасці незабыўных асацыятыўных вобразаў.

Рэпазіторый ВДУ

Усе гэтыя перавагі выкарыстання сродкаў музея гавораць аб тым, што ў свядомасці будучага настаўніка фарміруецца вобраз "я" як сучаснага прадстаўніка грамадства праз прызму гісторыі. Перанос у свядомасць цэласнага вобраза мінулага, якое накладваецца на эмацыянальную сферу асобы, садзейнічае фарміраванню светапогляду сучаснага чалавека, які ўспрымае свет аналітычна-ацэначна з пазіцый культурнай гістарычнай спадчыны. Такім чынам магчыма пазбегнуць вузкай накіраванасці ў падрыхтоўцы будучага педагога, што забяспечвае яго асобаснае фарміраванне.

Як сцвярджаюць польскія даследчыкі, працэс навучання тут "адрозніваецца ад здабывання ведаў у звычайных адукацыйных установах, таму што ў дачыненні да наведвальнікаў музея гутарка ідзе больш як аб тых, якія вучацца нефармальна" [11, с. 26]. Аднак, на наш погляд, выкарыстаць усе перавагі музейна-педагагічнай дзейнасці ў дачыненні да будучых настаўнікаў неабходна мэтазгодна і сістэмна. Толькі так можна зрабіць значны ўклад у справу іх падрыхтоўкі.

Формы ўзаемадзеяння ВНУ і музея могуць быць самымі разнастайнымі:

- экскурсія (аглядная, тэматычная, тэатралізаваная);
- лекцыі (аглядныя, тэматычныя);
- кансультацыі (для вучняў, для настаўнікаў);
- урок у музеі (вывучэнне новай тэмы, камбінаваны, абагульняючы);
- віктарыны і гульні (заданні, загадкі, мадэляванне);
- алімпіяды;
- масавыя мерапрыемствы (святы, тэатралізацыі, віншаванні пераможцаў конкурсаў і алімпіяд і інш.);
- сустрэчы са знакамітымі людзьмі (пісьменнікамі, архітэктарамі, мастакамі, народнымі майстрамі і г.д.);
- удзел у працы музейных гурткоў і клубаў і інш.

Усе формы супрацоўніцтва з'яўляюцца вельмі важнымі, аднак хацелася б падкрэсліць важнасць падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да іх выкарыстання сродкаў музея ў сваёй працы ў навучальнай установе. На нашу думку, існуе неабходнасць у падрыхтоўцы педагогаў да мэтанакіраванага супрацоўніцтва з гэтай установай, якое павінна спалучацца з уласнай асобаснай зацікаўленасцю да набыткаў духоўнай культуры чалавецтва, прыхільнасцю да эстэтыкі і ўстойлівасцю ў адносінах да псеўдакультуры і амаральнасці.

Уменне ацаніць перспектыўнасць і эфектыўнасць той ці іншай формы супрацоўніцтва ВНУ і музея, знайсці аптымальнае месца для іх у сваёй дзейнасці, распрацаваць гэтыя формы, прадугледзець усе этапы іх правядзення, прааналізаваць і спрагназаваць іх вынікі, а ў наступным правесці самому экскурсію па экспазіцыі музея, разумеючы спецыфіку гэтай установы культуры, – гэта неад'емныя атрыбуты прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да выкарыстання адукацыйных сродкаў "храма муз".

Эксперыментальная мадэль будучага настаўніка, падрыхтоўка якога ажыццяўляецца ў прасторы "ўніверсітэт–музей", змяшчае ў сабе шэраг кампетэнцый, якія ўключаюць:

- сфарміраваныя свядомыя адносіны да рэальнасці (рэальная ацэнка сучаснага жыцця соцыуму на аснове крытычнага аналізу падзей і супастаўленне з мінулым гістарычным вопытам у свеце, краіне, у асобнай мясцовасці, усведамленне значнасці падзей, якія адбываюцца ў жыцці свету, народа, канкрэтнай сям'і, асобы, ацэнка іх агульначалавечай і эстэтычнай каштоўнасці);
- сфарміраванае цэласнае бачанне свету (успрыманне сацыяльнага, эканамічнага, культурнага, побытавага жыцця соцыуму на макра- і мікраўзроўні ў адзінстве, цэласнае візуальнае, эстэтычнае і гістарычнае ўспрыманне прадметаў і з'яў);
- веды аб сэнсавай і каштоўнаснай сутнасці музейных прадметаў і перанясенне гэтых ведаў на сучаснасць, разуменне гістарычнай сутнасці (як на мікраўзроўні, так і на макраўзроўні) усяго таго, што захоўваецца ў музеі: прадметаў быту, летапісных і друкаваных крыніц, фотаздымкаў, помнікаў розных відаў мастацтва, архітэктуры;
- беражлівыя адносіны да навакольных прадметаў (разуменне іх значнасці для сённяшняга жыцця і карысці для нашчадкаў);
- веды аб ролі асоб у сацыяльным жыцці грамадства (разуменне ролі гістарычных асоб у культурным, палітычным, эканамічным жыцці краіны, усведамленне значнасці ўкладу кожнага

Рэпазіторый ВДУ

чалавека ў сацыяльнае развіццё грамадства, веданне біяграфій, асобных учынкаў знакамітых людзей, успрыманне іх як прыклад для пераймання);

- веды аб культурнай значымасці ўсяго, што адбываецца ў пэўнай мясцовасці: падзеі, людзі, даты (сфарміраваныя ўстойлівыя асацыятыўныя сувязі), выставы, канцэрты, спектаклі, фестывалі, адкрыццё новых сацыяльна-культурных цэнтраў, святкаванні розных важных дат, падзей у горадзе, мястэчку ці вёсцы;
- бачанне сувязі мінулага і сённяшніх падзей (разуменне цеснай сувязі гістарычнага мінулага і сучаснага развіцця краіны, неабходнасці наследаваць пазітыўны вопыт і рабіць адпаведныя высновы з памылак самых розных гістарычных дзеячаў);
- разуменне значэння прадметаў побыту, інтэр’ера, фарміраванне ў свядомасці “вобразаў культуры” (на аснове цэласнага ўспрымання прадметаў і ведання выдатных набыткаў сусветнага і нацыянальнага мастацтва, фарміравання ўмення ацаніць каштоўнасць навакольных рэчаў, прадметаў і з’яў);
- сфарміраваны светапогляд, перакананні асобы (веды аб навакольным свеце і яго культурных каштоўнасцях на мікра- і макраўзроўнях, усведамленне значымасці стваральнай дзейнасці асобы ў сістэме гэтых каштоўнасцей);
- уменне актывізаваць пошукавую дзейнасць навучэнцаў (уменне зацікавіць гістарычнымі фактамі, падзеямі, жыццём вядомых асобаў, уменне прадэманстраваць прычынна-выніковыя сувязі мінулага і сучаснасці і выклікаць жаданне напісаць сваю каштоўную, эстэтычна і культурна вартасную старонку ў гісторыі грамадства, народа, сям’і);
- уменне праводзіць сувязь паміж тэарэтычнымі ведамі і практыкай (ілюстрацыя тэарэтычнага матэрыялу прыкладамі, правядзенне гістарычных сувязей, паралелей, дэманстрацыя, выраб, прэзентацыя прадметаў рэальнасці, непасрэдна звязаных з матэрыялам, які вывучаецца);
- уменне ўзбагаціць матэрыял падрабязнасцямі і дэталямі (выкладанне тэмы з цікавымі і падрабязнымі фактамі, гістарычнымі паралелямі, апора на сферу сучаснага жыцця моладзі і кола іх інтарэсаў);
- эстэтычная выхаванасць, сфарміраваны эстэтычны густ (уменне бачыць, заўважаць прыгожае навокал, імкненне да стварэння прыгожага);
- культура паводзін, зносін (уменне паводзіць сябе адэкватна і прыстойна адпаведна з прынятымі агульнаэтычнымі нормамі грамадства і згодна з культурнай традыцыі сваёй краіны, свайго соцыуму).

Пры супастаўляльным аналізе дадзенай мадэлі педагога і прафесійных кампетэнцый настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, гісторыі, біялогіі і пачатковых класаў (абазначаных у стандартах дадзеных спецыяльнасцей) намі былі выдзелены асобасныя якасці, якія ўдасканальваюць прафесійную падрыхтоўку педагога.

Якасці асобы, фарміраванне якіх ажыццяўляецца ў адзінай прасторы “ўніверсітэт–музей” і якія з’яўляюцца важнымі для адукацыі будучых настаўнікаў, наступныя:

1) гістарызм мыслення (прынцып падыходу да рэчаіснасці, якая развіваецца ў часе);
2) цэласнасць успрымання з’явы (уласцівасць успрымання, якая заключаецца ў тым, што кожны аб’ект, а тым больш прасторавая прадметная сітуацыя ўспрымаюцца як устойлівае сістэмнае цэлае, нават калі некаторыя часткі гэтага цэлага ў дадзены момант не назіраюцца);
3) культурнасць у паводзінах (высокі ўзровень культуры ў дзеяннях, што адпавядае светапогляду асобы, яго перакананням);
4) эстэтычнасць поглядаў і паводзін (вытанчанасць, прыгажосць, прасякнутыя эстэтызмам).

З мэтай выяўлення, наколькі падобныя якасці сфарміраваны ў студэнтаў, якія навучаюцца на педагагічных спецыяльнасцях, намі была распрацавана анкета, у склад якой уваходзіла 20 пытанняў, што былі разбіты на 4 блокі згодна з колькасцю асобасных якасцей, якія ацэньваліся.

У першым блоку былі змешчаны 5 пытанняў для ацэнкі студэнтамі такой якасці, як гістарызм мыслення. Другі блок пытанняў быў прызначаны для самаацэнкі цэласнасці ўспрымання з’явы, якая заключаецца ў здольнасці ўспрымаць з’явы як устойлівае сістэмнае цэлае. Трэці блок – для ацэнкі агульнай культуры, якая заключаецца ў веданні каштоўнасцей свайго соцыуму і жаданні іх

Рэпазіторый ВДУ

прытрымлівацца, што з’яўляецца часткай асобаснай сферы, у якой сканцэнтраваны ідэалы, перакананні. Апошні блок прызначаны для ацэнкі эстэтычнасці ў поглядах і паводзінах, якая выражаецца ў здольнасці заўважаць прыгожае навокал і ацаніць гэта хараство.

Кожны адказ студэнтаў адлюстроўваў іх меркаванне па пяцібальнай шкале. За высокі ўзровень развіцця якасці мы прымалі сярэдні бал ад 4,1 да 5, за сярэдні ўзровень – 3 да 4, за нізкі – ад 1 да 2,9.

Вынікі апытання перад пачаткам правядзення эксперымента прадстаўлены ў табл. 1.

Табліца 1

**Самаацэнка студэнтамі I курса дзённай формы навучання спецыяльнасці “Лагапедыя” ступені сфарміраванасці сваіх якасцей**

| | Высокі ўзровень | | Сярэдні ўзровень | | Нізкі ўзровень | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сярэдні бал пры ацэнцы | 4,1 да 5 | | ад 3 да 4 | | ад 1 да 2,9 | |
| Гістарызм мыслення | 11 | 36% | 17 | 57% | 2 | 7% |
| Цэласнасць успрымання з’явы | 10 | 33% | 18 | 60% | 2 | 7% |
| Культурнасць у паводзінах | 8 | 27% | 21 | 70% | 1 | 3% |
| Эстэтычнасць поглядаў і паводзін | 12 | 40% | 15 | 50% | 3 | 10% |

Вынікі, прадстаўленыя ў табл. 1, можна адлюстраваць у працэнтных суадносінах у дыяграме (мал. 1).




Мал. 1. **Самаацэнка рэспандэнтамі ступені сфарміраванасці сваіх якасцей у працэнтных суадносінах**

З апытаных студэнтаў была выдзелена група з сярэднім і нізкім узроўнем развіцця якасцей, з імі была праведзена праца па стварэнні цэласнай адукацыйнай прасторы ўніверсітэта і музея. Шляхі па стварэнні дадзенай прасторы намі акрэслены наступныя:

- выкарыстанне розных формаў супрацоўніцтва з музеем пры выкладанні дысцыплін (педагогіка, уводзіны ў педагагічную прафесію, сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, педагогіка сямейнага выхавання);
- прымяненне прынцыпу музеефікацыі адукацыі пры выкладанні дысцыплін (засяроджваецца ўвага на гістарычным аспекце матэрыялу, які вывучаецца, на яго культурнай і эстэтычнай функцыях,



Рэпазіторый ВДУ

скіроўваецца ўвага на змяненне стаўлення асобы студэнта да свайго ўласнага жыцця, да блізкіх людзей і навакольнага асяроддзя);

- уключэнне студэнтаў у творчую і даследчую дзейнасць у працэсе выканання заданняў, звязаных з дзейнасцю музея (напісанне эсэ, сачыненняў, распрацоўка планаў-канспектаў заняткаў, стварэнне прэзентацый на тэмы "Музей маёй мясцовасці", "Музей маёй сям'і", "Сродкі навучання і музей", "Выкарыстанне сродкаў музея на занятках у дашкольных установах адукацыі" і інш.);
- укараненне заняткаў, звязаных з выкарыстаннем адукацыйных сродкаў музея, у педагагічную практыку студэнтаў (наведванне гарадскога або школьнага музея, выкарыстанне фотаздымкаў і матэрыялаў сайтаў розных устаноў падобнага тыпу, паведамленняў вучняў на ўроках на аснове экспазіцыі, правядзенне слоўнікавай работы на ўроку і інш.).

Пасля правядзення эксперымента студэнты таксама былі апытаны з дапамогай той жа анкеты аб ацэнцы сваіх якасцей. Колькасць рэспандэнтаў – 18 чалавек, такая колькасць апытаных мела сярэдні або нізкі ўзровень развіцця пералічаных вышэй асобасных якасцей. Атрыманыя вынікі праілюстраваны ў табл. 2 і дыяграме на мал. 2–3.

Табліца 2

**Самаацэнка рэспандэнтамі ступені сфарміраванасці сваіх якасцей пасля правядзення эксперыментальных заняткаў**

| | Высокі ўзровень | | Сярэдні ўзровень | | Нізкі ўзровень | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сярэдні бал пры ацэнцы | 4,1 да 5 | | ад 3 да 4 | | ад 1 да 2,9 | |
| Гістарызм мыслення | 7 | 39% | 10 | 56% | 1 | 5% |
| Цэласнасць успрымання з'явы | 8 | 45% | 8 | 45% | 2 | 11% |
| Культурнасць у паводзінах | 5 | 28% | 12 | 67% | 1 | 5% |
| Эстэтычнасць поглядаў і паводзін | 11 | 61% | 5 | 28% | 2 | 11% |




Мал. 2. **Агульная колькасць студэнтаў з высокім узроўнем развіцця якасцей**

Рэпазіторый ВДУ




Мал. 3. **Агульная колькасць студэнтаў з высокім узроўнем развіцця якасцей у працэнтных суадносінах**

**Заключэнне.** Як паказаў праведзены эксперымент, колькасць студэнтаў з высокім узроўнем развіцця якасцей павялічылася. Гэта дае падставу сцвярджаць, што створаная адукацыйная прастора ўніверсітэта і музея пры падрыхтоўцы педагогаў-лагапедаў забяспечвае комплекснае фарміраванне такіх якасцей, як гістарызм мыслення, цэласнасць успрымання з'явы, культурнасць у паводзінах, эстэтычнасць поглядаў і перакананняў, што дае падставу гаварыць аб якаснай прафесійнай падрыхтоўцы будучага спецыяліста ў галіне педагогікі на аснове сфарміраванасці прафесійных кампетэнцый. Створаная прастора "ВНУ–музей" дазваляе ажыццяўляць асобаснае фарміраванне будучага педагога як гуманнага і дасведчанага ўдзельніка адукацыйнага працэсу, бо дапамагае развіць інтэлектуальныя здольнасці; узбагачае яго ведамі ў розных галінах навукі; уплывае на выхаванне агульнай культуры, эстэтычнага густу, на фарміраванне здольнасці да самааналізу; фарміруе актыўную жыццёвую пазіцыю дзякуючы шырокаму кругагляду і цэласнаму бачанню карціны свету; садзейнічае пераасэнсаванню свайго ўласнага жыцця. Усё адзначанае вышэй дае падставу сцвярджаць, што працэс прафесійнай падрыхтоўкі педагогаў-лагапедаў будзе арганізаваны пры гэтым больш якасна, чым пры традыцыйным выкладанні дысцыплін, таму што закранаецца тады светапоглядная і каштоўнасная сфера асобы, што забяспечвае трываласць засвоеных ведаў і яе развіццё.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Жук, О.Л. Педагогика. Практикум на основе компетентностного подхода: учеб. пособие для преподавателей, аспирантов и студентов высших учебных заведений / О.Л. Жук, С.Н. Сиренко; под общ. ред. О.Л. Жук. – Минск: РИВШ, 2007. – 182 с.
2. Казимирская, И.И. Воспитательный потенциал учреждений высшего образования: стратегии развития / И.И. Казимирская // Педагогическая наука и образование. – 2016. – № 2. – С. 11–14.
3. Педагогический терминологический словарь. Образовательное пространство [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pedagogical_dictionary.academic.ru/2179/Образовательное_пространство. – Дата доступа: 10.03.2019.
4. Герасимова, А.Ю. Образовательное пространство вуза как условие развития будущего профессионала [Электронный ресурс] / А.Ю. Герасимова // Экономика и экологический менеджмент. – 2014. – № 1. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/obrazovatelnoe-prostranstvo-vuza-kak-uslovie-razvitiya-buduschego-professionala. – Дата доступа: 10.03.2019.
5. Ванслова, Е.Г. Музей и школа: пособие для учителя / Е.Г. Ванслова, А.К. Ломунова, Э.А. Павлюченко и др.; сост. Э.А. Павлюченко; под общ. ред. Т.А. Кудриной. – М.: Просвещение, 1985. – 192 с.
6. Основы педагогического мастерства: учеб. пособие для пед. спец. высш. учеб. заведений / И.А. Зязюн, И.Ф. Кривонос, Н.Н. Тарасевич и др.; под ред. И.А. Зязюна. – М., 1989. – 302 с.


Репозиторий ВГУ

7. Березовин, Н.А. Основы психологии и педагогики: учеб. пособие / Н.А. Березовин, В.Т. Чепиков, М.И. Чеховских. – Минск: Новое знание, 2004. – 336 с.
8. Сериков, В.В. Личностно ориентированное образование: поиск новой парадигмы: монография [Электронный ресурс] / В.В. Сериков. – М., 1998. – Режим доступа: http://www.bim-bad.ru/docs/serikov_education_of_personality.pdf. – Дата доступа: 31.08.2018.
9. Назарова, Н.М. Специальная педагогика / Н.М. Назарова. – М.: ACADEMA, 2000. – 530 с.
10. Образовательный стандарт высшего образования. Высшее образование. Первая ступень. Специальность 1-03 03 01 Логопедия. Квалификация Учитель-логопед. Преподаватель = Вышэйшая адукацыя. Першая ступень = Higher education. First stage: стандарт / разраб. предисл. УО "Белорус. гос. пед. ун-т имени Максима Танка". – Введ. с 2013-09-01. – Минск: Мин-во образования Респ. Беларусь, 2013 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://intra.grsu.by/upstandart. – Дата доступа: 12.12.2017.
11. Muzea i uczenie się przez całe życie / [red. nauk.: Piotr Majewski]. – Warszawa: Narodowy Instytut Muzealnictwa i Ochrony Zbiorŏw, 2013. – 148 s.

*R E F E R E N C E S*

1. Zhuck O.L., Syrenko S.N. *Pedagogika. Praktikum na osnove kompetentnostnogo podkhoda: Uchebnoye posobiye dlia prepodavatelei, aspirantov i studentov vysshikh uchebnykh zavdenii* [Pedagogy. Training Workshop Based on the Skills Approach: Manual for Teachers, Graduate Students, and Students of Higher Educational Establishments], Mn.: RIVSh, 2007, 182 p.
2. Kazimirskaya I.A. *Pedagogicheskaya nauka i obrazovaniye* [Pedagogical Science and Education], 2016, 2, pp. 11–14.
3. *Pedagogicheski terminologicheski slovar. Obrazovatelnoye prostranstvo* [Pedagogical Glossary of Terms. Educational Space], Available at: https://pedagogical_dictionary.academic.ru/2179/Образовательное_пространство. – Accessed: 10.03.2019.
4. Gerasimova A.Yu. *Ekonomika i ekologicheski menedzhment, 2014, 1* [Economics and Environmental Management, 2014, 1], Available at: https://cyberleninka.ru/article/n/obrazovatelnoe-prostranstvo-vuza-kak-uslovie-razvitiya-buduschego-professionala. – Accessed: 10.03.2019.
5. Vanslova E.G., Lomunova A.K., Pavlyuchenko E.A. *Muzei i shkola. Posobiye dlia uchitelia* [Museum and School: Teacher's Handbook], M.: Prosveshcheniye, 1985, 192 p.
6. Zyazun I.A., Krivonos I.F., Tarasevich N.N. *Osnovi pedagogicheskogo masterstva: Ucheb. posobiye dlia ped. spets. vyssh. ucheb. zavedenii* [Basic Pedagogical Skills: Textbook for Pedagogical Universities], M., 1989, 302 p.
7. Berezovin N.A., Chepikov V.T., Chekhovskikh M.I. *Osnovy psikhologii i pedagogiki: Ucheb. posobiye* [Basics of Psychology and Pedagogy: Textbook], M.: Novoye znaniye, 2004, 336 p.
8. Serikov V.V. *Lichnostno orientirovannoye obrazovaniye: poisk novoi paradigmy. Monografiya* [Personality Oriented Education: Search for a New Paradigm. Monograph], M.: 1998, Available at: htpp://www.bim-bad.ru/docs/serikov_education_of_personality.pdf. – Accessed: 31.08.2018.
9. Nazarova N.M. *Spetsialnaya pedagogika* [Special Pedagogy], M.: ACADEMA, 2000, 530 p.
10. *Obrazovatelny standart vysshego obrazovaniya. Vyssheye obrazovaniye. Pervaya stupen. Spetsialnost 1-03 03 01 Logopediya. Kvalifikatsiya Uchitel-logoped. Prepodavatel.* [Educational Standard for Higher Education. Higher education. The First Stage. Qualification 1-03 03 01 Speech therapy. Qualification Teacher–Speech Therapist], Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University, Introduced in 2013, 09.01. Minsk: Ministry of Education of Belarus, 2013, Available at: https://intra.grsu.by/upstandart. – Accessed: 12.12.2017.
11. Muzea i uczenie się przez całe życie / [red. nauk.: Piotr Majewski]. – Warszawa: Narodowy Instytut Muzealnictwa i Ochrony Zbiorŏw, 2013. – 148 s.

*Паступіў у рэдакцыю 06.06.2019*
***Адрас для карэспандэнцыі:*** e-mail: s.grinko@inbox.ru – Грынько С.Д.

Репозиторий ВГУ